9(47.60)
П16

П. ПАНАМАРЭНКА

# ПЕРШАЯ ГАДАВІНА ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАЩЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК 1945 г.

9(47.60)
П16

*Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!*

Урадавая бібліятэка
Інв. №
ГОРАД

П. ПАНАМАРЭНКА

6689/1

# ПЕРШАЯ ГАДАВІНА ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

*(Выступленне Старшыні Совета Народных Камісараў Беларускай ССР таварыша П. К. Панамарэнка на VII Сесіі Вярхоўнага Совета БССР)*

Президентская библиотека
Республики Беларусь
8 800000 927886

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР

МІНСК 1945 г.

Инв.
1954 г.



Таварышы дэпутаты! VII сесія Вярхоўнага Совета Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі сабралася ўпершыню на поўнасцю вызваленай ад нямецкіх захопнікаў беларускай зямлі ў дні, калі ўсе народы вялікага Совецкага Саюза святкуюць перамогу над фашысцкай Германіяй.

Год назад гераічная Чырвоная Армія разграміла нямецкія арміі і выкінула іх вон з межаў Совецкай Беларусі, выратавала наш народ ад рабства і канчатковага знішчэння. Бітва за вызваленне Совецкай Беларусі ўвойдзе ў гісторыю Вялікай Айчыннай вайны, як адна з найвялікшых бітваў усіх войн. Бітва за вызваленне Совецкай Беларусі на ўвесь свет прадэманстрыравала сілу совецкага народа і яго арміі, сілу совецкай зброі і геніяльнасць ваеннага кіраўніцтва.

У выніку амаль чатырохгадовай гіганцкай бітвы, рашаючай лёс пакаленняў, гітлераўская Германія разгромлена і паверажана ў прах.

Совецкі народ, тераічная Чырвоная Армія адстаялі незалежнасць нашай Радзімы, выратавалі мільёны людзей ад рабства і знішчэння, выратавалі ад фашысцкага вандалізма цывілізацыю Еўропы.

Наша перамога азначае канец гітлераўскай фашысцкай дзяржавы, канец разбойніцкіх нашэсцяў нямецкіх імперыялістаў на ўсход, якія прыносілі незлічоныя пакуты і няшчасце народам нашай краіны. Совецкі народ святкуе найвялікшую ў гісторыі чалавецтва перамогу.

Совецкая дзяржава вытрымала ўсе выпрабаванні вайны і перамагла дзякуючы развіццю і арганізацыі сваёй гаспадаркі, вытрымцы і адзінству народа, майстэрству і баявому духу сваіх войск, стратэгіі і палітыцы дзяржаўнага кіраўніцтва.

Совецкі народ, ахоплены непрымірымай нянавісцю да прыгнятальнікаў і захопні-

каў, перанёс увесь цяжар і нягоды вайны, у жорсткіх схватках з ворагам паказаў цуды ваеннай храбрасці і працоўнага гераізма, бяспрыкладную стойкасць і самаадданасць.

За час Айчыннай вайны яшчэ больш умацавалася і загартавалася вялікая дружба народаў нашай краіны. Народы Савецкага Саюза, адстайваючы свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы, яшчэ цясней згуртаваліся вакол совецкай улады, большэвіцкай партыі, вакол свайго правадыра і настаўніка таварыша Сталіна *(працяглыя апладысменты).*

У разгроме немцаў сказалася бясстрашша і мужнасць рускага народа, які вёў за сабой усе народы Совецкага Саюза, сказалася перавага совецкай тэхнікі, сказалася сіла совецкай арганізаванасці, сіла совецкай культуры, крыніцай якіх з'яўляецца магутная совецкая дзяржава, створаная мудрасцю большэвікоў, геніем Леніна — Сталіна.

Совецкі Саюз перамог таму, што мае

гераічную Чырвоную Армію, натхнёную ўзвышанымі і благароднымі мэтамі вайны, аснашчоную магутнейшай ваеннай тэхнікай, кіруемай таленавітымі палкаводцамі.

Совецкі Саюз перамог таму, што натхніцелем і арганізатарам усенароднай барацьбы супроць гітлераўскіх захопнікаў з'явілася партыя Леніна — Сталіна, якая з'еднала ў адзінае і накіравала да агульнай мэты намаганні ўсіх совецкіх людзей, падпарадкаваўшы ўсе сілы і сродкі справе разгрому ворага.

Наш совецкі народ абавязан сваёй перамогай таму, хто падрыхтаваў да абароны нашу Айчыну, хто разам з Леніным стварыў, вырасціў і ўмацаваў нашу Чырвоную Армію, хто кіраваў стварэннем нашай магутнай індустрыі, якая дала ў часе вайны ўсё, што неабходна для разгрому ворага, хто накіраваў наша сялянства на шлях калгасаў, выратаваўшы армію і краіну ад голаду, ад недахопу сыравіны, таму, хто выхаваў совецкіх людзей у духу беззаветнага служэння Радзіме, у духу не-

парушнай дружбы народаў нашай краіны, хто выхаваў у іх гераізм і бясстрашша, стойкасць і мужнасць, — нашаму вялікаму правадыру і настаўніку таварышу Сталіну *(усе ўстаюць, працяглыя апладысменты).*

З велізарным задавальненнем і радасцю сустрэў увесь савецкі народ вестку аб прысваенні таварышу Сталіну звання Героя Савецкага Саюза, узнагароджанні яго другім ордэнам «Победа» і прысваенні яму вышэйшага воінскага звання — Генералісімуса Савецкага Саюза, як выражэнне найвялікшых гістарычных заслуг таварыша Сталіна перад нашай Радзімай, перад народамі нашай краіны, перад усім прагрэсіўным чалавецтвам *(усе ўстаюць, працяглыя апладысменты, якія пераходзяць у авацыю).*

Таварышы дэпутаты! Беларусь за сваю гісторыю многа разоў падвяргалася нападам захопнікаў, якія марылі пакарыць землі славянскага Усхода. Беларуская зямля на працягу многіх стагоддзяў была арэнай вельмі жорсткіх бітваў і схватак.

На нашай зямлі часта рашаўся лёс не толькі беларускага народа, але і лёс другіх народаў і дзяржаў Еўропы. Землі Беларусі таптаЛі полчышчы нямецкіх захопнікаў-мечаносцаў, полчышчы Фрыдрыха Другога, полчышчы шведскіх захопнікаў Карла XII, полчышчы Напалеона.

На долю нашага пакалення выпала тры разы сустрэцца тварам да твару са звярыным нямецкім імперыялізмам. У вайну 1914 года нямецкія захопнікі вытапталі, спалілі і спустошылі палавіну гарадоў і сёл Беларусі; у 1918 годзе нямецкія захопнікі акупіравалі амаль усю Беларусь і прынеслі ў яе рэжым грабяжу, гвалту і забойстваў. І, нарэшце, у гэтую Вялікую Айчынную вайну ўвесь народ Савецкага Саюза і народ Савецкай Беларусі зноў сутыкнуліся са звярыным тварам нямецкага фашызма, з пагрозай заняволення і знішчэння.

І, як гэта відаць з мінулага і вопыту нашых дзён, для ўсіх і ўсякіх захопнікаў падзеі на нашай зямлі паўтараліся і нязмен-

на заканчваліся сакрушальным іх разгромам і выгнаннем.

У мінулых войнах беларускі народ, які знаходзіўся пад прэсам палітычнага, эканамічнага і нацыянальнага гнёту, у барацьбе супроць захопнікаў адстайваў сваю нацыянальную незалежнасць. У Вялікую Айчынную вайну совецкага народа супроць фашысцкай Германіі беларускі народ упершыню за сваю гісторыю разам з народамі ўсяго Совецкага Саюза адстайваў сваю любімую Радзіму — вялікі Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, сваю беларускую совецкую дзяржаву, створаную Леніным і Сталіным у 1919 годзе, адстайваў свабоду, чэсць і незалежнасць сваёй дзяржавы, адстайваў заваяванні Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі.

Ахоплены смяртэльнай нянавісцю да нямецкіх захопнікаў, беларускі народ з першых-жа дзён па закліку таварыша Сталіна ўзняўся на абарону совецкай Радзімы.

Плячом к плячу са сваім старэйшым, найбольш блізкім і родным братам — вялікім рускім народам, з украінскім і другімі народамі нашай Радзімы, беларускі народ з бяспрыкладнай мужнасцю змагаўся на палях бітваў за чэсць, свабоду і незалежнасць Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і тым самым за сваю Беларускую Совецкую Соцыялістычную дзяржаву.

У радах Чырвонай Арміі і ўсенародным партызанскім руху супроць захопнікаў змагаліся мільёны сыноў і дачок беларускага народа. Наступленне Чырвонай Арміі ў Беларусі праходзіла ва ўмовах усенароднай дапамогі і падтрымання нашых войск, ва ўмовах усенароднага выступлення супроць нямецкіх захопнікаў.

Гэтай барацьбой Беларусь унесла вялікі ўклад у агульную справу разгрому ворага.

У бясстрашнай і мужнай барацьбе на палях бітваў Вялікай Айчыннай вайны вырас і загартаваўся беларускі народ, яшчэ больш вырасла яго нацыянальная сама-

свядомасць. Наш народ яшчэ больш стаў цаніць і любіць совецкую ўладу, сваю свабоду, зямлю, перададую яму навечна, калгасны лад, пагрозу страты якіх ён так рэальна адчуў у перыяд нямецкай акупацыі.

У Вялікай Айчыннай вайне беларускі народ, рабочы клас, калгаснікі і аднаасобнае сялянства, совецкая інтэлігенцыя паказалі непарушнае адзінства і бязмежную адданасць сваёй Айчыне — вялікаму Совецкаму Саюзу, большэвіцкай партыі, свайму правадыру таварышу Сталіну *(працяглыя апладысменты)*.

Совецкая Беларусь падверглася за тры годы акупацыі велізарнаму разбурэнню.

Разбураны прамысловасць, сельская гаспадарка, установы культуры, навукі і мастацтва. Загінула больш палавіны нацыянальнага багацця рэспублікі. Знішчаны плады шматгадовых прац беларускага народа.

Нямецкія захопнікі разбурылі нашы гарады, у тым ліку і сталіцу Совецкай Бела-

русі — горад Мінск, пазбавіўшы жылля і ўсіх умоў чалавечага існавання мільёны людзей.

Захопнікі разбурылі калгасы, разграбілі і знішчылі іх маёмасць. Як носьбіты самага разбойніцкага імперыялізма і рэакцыі, яны зверска расправіліся з калгасным сялянствам, прабуючы зламаць яго свабодалюбівы дух. Шляхам тэрора і разбою нямецкія захопнікі прабавалі знішчыць новыя соцыялістычныя адносіны ў вёсцы, якія ўзніклі ў выніку перамогі калгаснага ладу.

Замыслы нямецкіх акупантаў зводзіліся да таго, каб адабраць у совецкіх сялян зямлю і ўсё тое, што далі ім совецкая ўлада і калгасны лад і ператварыць сялян у рабоў нямецкіх памешчыкаў.

Захопнікі разбурылі і спалілі тысячы сёл і вёсак, ператварылі цэлыя раёны ў пустыні. Немцамі спалена і разбурана толькі ў сельскай мясцовасці звыш 1.200 тысяч жылых дамоў, гаспадарчых пабудоў, адміністратыўных і культурных устаноў.

Жыццёвы ўзровень насельніцтва ў вы-

ніку нямецкай акупацыі вельмі панізіўся, народ аказаўся пазбаўленым неабходных прадметаў хатняга ўжытку, жылля, адзення, птушкі, жывёлы. Да вайны ў Беларусі не было ні адной калгаснай сялянскай сям'і, якая не мела-б каровы; зараз не мае кароў больш палавіны сельскага насельніцтва.

Сотні тысяч сыноў і дачок беларускага народа замучаны нямецкімі захопнікамі. Памяць аб іх заклікае да адплаты, да суровага пакарання гітлераўскіх катаў і зачыншчыкаў вайны.

Гераічная Чырвоная Армія выратавала беларускі народ ад нямецкага рабства і знішчэння, вярнула свабоду і незалежнасць працоўным Беларусі, выратавала народную гаспадарку ад канчатковага знішчэння.

З першых-жа дзён вызвалення ў рэспубліцы пачаліся аднаўленчыя работы ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, пачалося аднаўленне ўстаноў навукі і культу-

ры, а таксама жылля калгаснікаў, рабочых і служачых.

Ва ўмовах старай царскай Расіі з яе адсталым прамысловым развіццём і індывідуальнай дробнай сялянскай гаспадаркай такія разбурэнні ў народнай гаспадарцы азначалі-б дзесяцігоддзі галечы і неймаверных няшчасцяў мільёнаў людзей.

Нашай дзяржаве, калгаснаму ладу пад сілу вырашэнне такой гіганцкай задачы, як аднаўленне разбуранай немцамі народнай гаспадаркі ў кароткі тэрмін.

У кароткі тэрмін, напрыклад, былі аднаўлены многія буйныя прамысловыя прадпрыемствы, неабходныя для забяспечання патрэб нашых войск. Сотні тысяч людзей вышлі на аднаўленне чыгунак і мастоў, жыццёва неабходных для нашых франтоў. Не гледзячы на вялікія разбурэнні, паязды падаваліся і рухаліся амаль услед за наступаючай Чырвонай Арміяй. На трэці дзень вызвалення паязды прышлі ўжо на самыя заходнія пуці Беларусі, да Брэста.

У сучасны момант ужо адноўлены і пушчаны ў ход сотні прадпрыемстваў, неабходных перш за ўсё для абслугоўвання патрэб нашых войск, аднаўленчых работ і забяспечання насельніцтва. Арганізавана некалькі тысяч саматужна-прамысловых арцелей і дробных прадпрыемстваў па абслугоўванню неадкладных патрэб насельніцтва.

Пачатае пасля вызвалення аднаўленне калгасаў, працякаўшае пры небывалым палітычным уздыме і энтузіязме народа, з велізарнай сілай падкрэсліла жыццёвую сілу калгаснага ладу. На працягу аднаго месяца былі адноўлены ўсе калгасы рэспублікі.

Калгаснікі і калгасніцы Беларусі ўжо дабіліся значных поспехаў у справе ўмацавання калгаснай гаспадаркі.

У цяжкай ваеннай абстаноўцы калгасы, якія мелі ўсяго толькі адну чвэрць конскага пагалоўя ад даваеннага часу, паспяхова справіліся з усімі сельскагаспадарчымі работамі мінулага года і пераві-

каналі свае абавязацельствы перад дзяржавай па здачы сельскагаспадарчай прадукцыі.

Дзяржаўны план веснавой сяўбы гэтага года, па размерах блізкі да даваеннага, выканан поўнасцю і своечасова. Гэтым закладзены сур'ёзныя асновы далейшага ўмацавання калгаснай гаспадаркі.

З моманту вызвалення ўжо адбудавана больш 125 тысяч жылых дамоў на сяле, адноўлена больш 2,5 тысячы больніц і медпунктаў, больш 10 тысяч школ. У мінулым навучальным годзе ў школах ужо навучалася больш аднаго мільёна дзяцей.

Аднак гэта толькі пачатак работы па аднаўленню народнай гаспадаркі і стварэнню нармальных умоў для жыцця насельніцтва.

Перад беларускім народам, партыйнымі і савецкімі арганізацыямі Беларусі стаяць велізарныя задачы поўнай ліквідацыі вынікаў нямецкай акупацыі. Неаб-

ходна аднавіць сваю прамысловасць і, перш за ўсё, яе вядучыя галіны—энергетыку, здабычу паліва, выраб будматэрыялаў, машынабудаўніцтва і рушыць уперад далейшую індустрыялізацыю рэспублікі. Неабходна аднавіць установы культуры, навукі і мастацтва беларускага народа. Мы абавязаны ўсямерна расшырыць выраб тавараў шырокага спажывання, каб узняць агульны жыццёвы ўзровень народа, забяспечыць яго прадметамі шырокага спажывання і хатняга ўжытку.

Асноўная задача ў галіне сельскай гаспадаркі заключаецца ў тым, каб ужо ў наступным годзе аднавіць даваенныя пасеўныя плошчы калгасаў, аднавіць агратэхніку, адрадзіць усе галіны калгаснай гаспадаркі, у асаблівасці жывёлагадоўлю, птушкагадоўлю, рыбаводства, сады і пасекі.

Перад намі стаіць задача аднаўлення велізарнай колькасці разбураных і спаленых дамоў калгаснікаў і культурна-бытавых установ сяла. Мы ставім задачу —

у бліжэйшыя два годы развіць паўсямесна выраб цэглы і чарапіцы да такіх размераў, каб яны сталі асноўнымі будаўнічымі матэрыяламі ў сельскім будаўніцтве. Для гэтага ў нас ёсць усе ўмовы ў выглядзе паўсямесных залежаў керамічных глін і паліва — торфу для абпалу.

Пераход на будаўніцтва сельскіх пабудоў з цэглы і чарапіцы дазволіць стварыць для калгаснікаў, рабочых і служачых зручныя, трывалыя, прыгожыя дамы і палепшыць значна агульны выгляд нашай вёскі.

Нам неабходна ўлічыць увесь велізарны вопыт вайны для таго, каб аднаўленчыя работы ў Беларусі былі падпарадкаваны ўмовам максімальнага павышэння абароназдольнасці рэспублікі.

Зараз совецкі народ чакае звароту з арміі, згодна Закона, прынятага XII сесіяй Вярхоўнага Совета Саюза ССР, дэмабілізаваных байцоў старэйшых узростаў Чырвонай Арміі.

Беларускі народ з хваляваннем і радасцю чакае і рыхтуецца да дастойнай сустрэчы нашых воінаў-пераможцаў, якія вяртаюцца з фронта.

Партыйныя і совецкія арганізацыі рэспублікі прыкладуць усе намаганні, каб стварыць дэмабілізаваным з Чырвонай Арміі байцам і афіцэрам усе ўмовы для пасяховай работы па аднаўленню народнай гаспадаркі і акружаць іх увагай і клопатамі.

Зварот увенчаных славай герояў-пераможцаў у родныя гарады і сёлы ўнясе жыватворчую струю ў аднаўленчыя работы.

У аднаўленні разбуранай нямецкімі акупантамі народнай гаспадаркі Совецкай Беларусі, у сваёй плённай творчай працы беларускі народ адчувае паўсядзённую дапамогу вялікага рускага народа і ўсіх народаў Совецкага Саюза, увагу і клопаты совецкага ўрада, большэвіцкай партыі, адчувае ўвагу і клопаты асабіста таварыша Сталіна *(апладысменты)*.

Беларускі народ, апіраючыся на палітычную, ваенную і эканамічную магутнасць **совецкай** дзяржавы, на брацкую дапамогу саюзных рэспублік, сваёй самаадданай працай адновіць разбураную немцамі народную гаспадарку, адродзіць социялістычную прамысловасць і сель-

скую гаспадарку, сваю культуру і мастацтва. Беларускі народ не пакладаючы рук будзе ўмацоўваць абароназдольнасць краіны і магутнасць Чырвонай Арміі, як залог працяглага міру і гарантыю мірнай працы народаў.

З Вялікай Айчыннай вайны совецкая дзяржава, кіруемая вялікім Сталіным, накіроўваемая партыяй Леніна — Сталіна, вышла яшчэ больш магутнай, а Чырвоная Армія вышла з вайны першакласнай, перадавой, найбольш моцнай арміяй у свеце.

Ніколі яшчэ палітычны прэстыж і сіла нашай Радзімы не былі так высокі, як цяпер.

За час вайны выраслі і ўмацаваліся совецкія социялістычныя рэспублікі, якія ўваходзяць у вялікі Совецкі Саюз. За час вайны вырас палітычны прэстыж Совецкай Беларусі, гераічная барацьба і ўклад якой у справу разгрому гітлераўскіх захопнікаў выклікалі прызнанне і захапленне ўсіх Аб'еднаных нацый. Працэс бурнага палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця, які прайшла Беларусь за годы совецкай улады, быў прадоўжан у часе

вайны мерапрыемствамі па далейшаму развіццю і ўмацаванню беларускай дзяржавы.

Дзесятая сесія Вярхоўнага Совета Саюза ССР прыняла закон, згодна якога совецкім рэспублікам прадастаўлена права мець воінскія фарміраванні і рэспубліканскія наркаматы абароны, а таксама закон аб прадастаўленні совецкім рэспублікам паўнамоцтваў у галіне знешніх зносін і аб пераўтварэнні ў сувязі з гэтым Народнага камісарыята замежных спраў з агульнасаюзнага ў саюзна-рэспубліканскі народны камісарыят.

Гэтае рашэнне прадстаўляе буйнейшую падзею ў жыцці Совецкай Беларусі і азначае новую ступень у справе развіцця і ўмацавання беларускай дзяржавы.

Беларусь, як суверэнная дзяржава, атрымала міжнароднае прызнанне і прынята ў якасці першапачатковага членаўстаноўцы Міжнароднай Арганізацыі для падтрымання міру і бяспекі. Удзелам у Канферэнцыі свабодалюбівых нацый у Сан-Францыска і падпісаннем Статута Аб'еднаных нацый, як асновы арганізацыі міжнароднай бяспекі, беларускі народ

уносіць свой уклад у справу барацьбы за працяглы мір і ўсеагульную бяспеку.

Актам гістарычнага значэння з'яўляецца таксама прызнанне з боку Аб'еднаных нацый і Часовага Урада Польшчы заходніх граніц БССР, і прызнання такім чынам гістарычнай для Беларусі падзеі ўз'еднання беларускага народа і ўключэнне Заходняй Беларусі ў састаў адзінай беларускай дзяржавы назаўсёды.

Таварышы дэпутаты! Вялікі рускі народ на працягу ўсёй гісторыі адыгрываў выдатную ролю ў лёсе беларускага народа. Слаўныя продкі рускага народа не раз працягвалі руку брацкай дапамогі нашаму народу. Пад кіраўніцтвам і разам з рускім народам народы нашай Радзімы скінулі царызм і ўстанавілі савецкую ўладу. З дапамогай рускага народа за годы савецкай улады Беларусь ператварылася з адсталай ускраіны царскай Расіі ў перадавую індустрыяльна-калгасную рэспубліку.

Пры дапамозе рускага народа адбылося ўз'еднанне беларускіх зямель у адзінай дзяржаве.

З дапамогай храбрага і мужнага вялі-

кага рускага народа-сцяганосца ў Вялікую Айчынную вайну, дзякуючы бяспрыкладным гераічным працоўным і ваенным подвігам усіх народаў Савецкага Саюза Беларусь вызвалена ад нямецкага рабства і адноўлена як дзяржава.

Вось чаму ў беларускім народзе жывуць і будуць жыць у стагоддзях і перадавацца ад пакалення да пакалення пачуцці любві, дружбы і ўдзячнасці свайму старэйшаму, найбольш блізкаму і роднаму брату — вялікаму рускаму народу *(апладысменты)*.

Беларускі народ выказвае пачуццё глыбокай удзячнасці слаўным сталінскім маршалам, генералам, афіцэрам і нашым доблесным воінам Чырвонай Арміі, якія выканалі сваю гістарычную місію, адстаялі свабоду і незалежнасць нашай айчыны і вызвалілі беларускі народ ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў *(апладысменты)*.

Дазвольце мне ад імені беларускага народа выказаць найглыбейшую сардэчную падзяку байцам, сержантам, афіцэрам і генералам 1-га Беларускага фронта, іх слаўнаму палкаводцу — Маршалу Савецкага Саюза Георгію Канстанцінавічу Жукаву *(апладысменты)*, байцам, сержантам, афіцэрам і генералам 2-га Беларускага

фронта і іх палкаводцу — Маршалу Савецкага Саюза Канстанціну Канстанцінавічу Ракасоўскаму *(апладысменты)*, байцам, сержантам, афіцэрам і генералам 3-га Беларускага фронта і іх палкаводцу — Маршалу Савецкага Саюза Александру Міхайлавічу Васілеўскаму *(апладысменты)*, байцам, сержантам, афіцэрам і генералам 1-га Прыбалтыйскага фронта і іх камандуючаму генералу арміі Івану Хрыстафоравічу Баграмяну *(апладысменты)*.

Легендарныя подвігі зрабілі палкі і дывізіі Чырвонай Арміі пры вызваленні гарадоў і сёл Беларусі. Вобразы авеяных славай байцоў, афіцэраў, генералаў і маршалаў — герояў Вялікай Айчыннай вайны супроць нямецкіх захопнікаў будуць заўсёды жыць у сэрцах беларускага народа.

Пройдуць годы і стагоддзі, вырастуць новыя пакаленні, але ніколі наш народ не забудзе і свята будзе захоўваць у памяці імёны герояў — доблесных сыноў нашага народа, паўшых смерцю храбрых у барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

Імёны герояў, гістарычныя падзеі Айчыннай вайны будуць натхняць нас на новыя працоўныя подвігі, народ увекаве-

чыць герояў і гістарычныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны ў песнях, паэмах, цудоўных збудаваннях, творах культуры, у помніках дастойных геараічнай сталінскай эпохі.

Таварышы дэпутаты! Увесь росквіт жыцця на беларускай зямлі, геараічная барацьба беларускага народа з нямецкімі захопнікамі, перамога і вызваленне Совецкай Беларусі звязаны з іменем таварыша Сталіна.

Разам з вялікім Леніным таварыш Сталін стварыў беларускую дзяржаву і вёў яе па шляху эканамічнага, культурнага і нацыянальнага развіцця. Вобраз таварыша Сталіна натхняў беларускі народ на самаадданую барацьбу з нямецкімі захопнікамі. З іменем таварыша Сталіна ішлі ў бой воіны-беларусы на ўсіх франтах Вялікай Айчыннай вайны. Імя таварыша Сталіна з'яўлялася сцягам усенароднай партызанскай барацьбы беларускага народа з нямецкімі захопнікамі.

Беларускі народ перадае свае пачуцці ўдзячнасці, любві і адданасці вялікаму правадыру совецкай дзяржавы, натхніцелю і арганізатару разгрому гітлераўскай Германіі нашаму таварышу Сталіну *(бур-*

*ныя, працяглыя апладысменты, усе ўстаюць).*

Няхай жыве правадыр народаў, арганізатар перамогі, Генералісімус Совецкага Саюза, вялікі і любімы таварыш Сталін! *(Бурныя, працяглыя апладысменты. Усе ўстаюць. Аркестр выконвае Гімн Совецкага Саюза. Зноў бурныя апладысменты. Воклічы «Ура!»)*

---

**Адказны за выпуск Д. Лебедзеў**

АТ 28267. Падпісана да друку 11/VII-45 г. Тыраж 10 тыс. экз.
Фармат паперы 70 × 108/32 Аб'ём 0,6 аўт. арк.
Друк. арк 7/8. Заказ № 1971

Друкарня імені Сталіна, Мінск, вул. Пушкіна 55.

Цана 75 кап.